*М. А. Крэнць*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*M. Krents*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(476)«1861/1914»+323**

# КАНТРЫБУЦЫЙНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ЎРАДА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ (1863–1896): ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

# CONTRIBUTION MEASURES OF RUSSIAN IMPERIAL GOVERNMENT IN THE BELARUSIAN PROVINCES (1863–1896): HISTORIOGRAPHY OF THE QUESTION

*У артыкуле разглядаецца гістарыяграфія па праблеме кантрыбуцыйных мерапрыемстваў на тэрыторыі беларускіх губерняў. Аўтар аналізуе асноўныя працы па гісторыі пытання кантрыбуцыйных мерапрыемстваў, разглядае дынаміку і тэндэнцыі развіцця гістарыяграфіі ўрадавай палітыкі Расійскай імперыі на тэрыторыі беларускіх губерняў, вылучае некалькі напрамкаў у гістарыяграфіі: дарэвалюцыйны, савецкі, сучасны, адзначае розныя падыходы да аналізу праблемы ў залежнасці ад гістарычнага перыяду, спрабуе класіфікаваць гістарычныя школы ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі з улікам метадалогіі даследавання дадзенай праблематыкі. Аўтар прыходзіць да вы-*

*сновы, што тэма ўрадавай палітыкі шырока прадстаўлена ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, пры гэтым некаторыя аспекты не разглядаюцца і не прымаюцца да ўвагі, і адзначае, што праблема кантрыбуцыйных мерапрыемстваў практычна не разглядалася ў гістарыяграфіі, толькі фрагментарна і без усебаковага аналізу.*

*Ключавыя словы: гістарыяграфія; гістарыяграфія гісторыі Беларусі; кантрыбуцыйныя мерапрыемствы; працэнтныя зборы; абмежавальныя мерапрыемствы.*

*The article considers the historiography of problem of contribution measures in the Belarusian provinces. Author analyses the background of the issue of contribution measures, Considers the dynamics and trends of the historiography of Russian empire Government's policy. The author singles out several directions in historiography: pre-revolutionary, Soviet, modern. The author notes different approaches to analysing the problem depending on the historical period. The author classifies historical schools in national and foreign historiography based on the methodology of the study. The author concludes that the subject of government policy is widely covered in the domestic and foreign historiography, but does not deal with or even mention some aspects. The author came to the conclusion that the problem of contribution measures was addressed in a piecemeal manner and without comprehensive analysis and very little research of sufficient quality has been undertaken in this area.*

*Keywords: historiography; historiography of the history of Belarus; contribution measures; percentage taxes; restrictive policy.*

Палітыка ўрада Расійскай імперыі на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX ст. патрабуе падрабязнага вывучэння. Гэта перыяд буржуазных рэформ, якія праводзіліся на фоне неадназначнай палітыкі на тэрыторыі беларускіх губерняў. Практыка рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ўключала шэраг з'яў і асобных рэгіянальных ці лакальных аспектаў, якія патрабуюць вывучэння. На тэрыторыі «заходніх губерняў», сярод якіх былі Віленская, Ковенская, Мінская, Гродненская, Магілёўская, Віцебская, Кіеўская, Валынская і Падольская, праводзілася палітыка ўніфікацыі, якая была звязана з іншымі мерапрыемствамі ўрада – кантрыбуцыйнымі зборамі і абмежаваннямі. Дадзеная палітыка адпавядала мэтам урада па канчатковай інтэграцыі «заходніх губерняў» у сістэму Расійскай імперыі, забяспечыць там дамінаванне землеўладальнікаў рускага паходжання. У дадзеным артыкуле падаецца гістарыяграфічны агляд кантрыбуцыйных мерапрыемстваў на тэрыторыі Віленскай, Гродненскай, Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў.

У гісторыі даследавання кантрыбуцыйных мерапрыемстваў можна выдзеліць тры асноўных этапа: дарэвалюцыйны, савецкі і сучасны.

Дарэвалюцыйны этап уключае працы сучаснікаў тых падзей, як правіла, кадравых чыноўнікаў і юрыстаў дзяржаўнага апарату Расійскай імперыі.

Савецкі перыяд (1917–1991 гг.) характарызуецца ўвядзеннем у зварот новых гістарычных крыніц, з'яўленнем новых метадаў даследавання, але ў той жа час ідэалагізаванасць савецкай гістарычнай школы не дазваляла

праводзіць дэтальны аналіз гістарычных падзей і працэсаў, некалькі звужала тэматыку даследаванняў.

Сучасны перыяд пачынаецца з 1990-х і характарызуецца адметным пашырэннем тэматыкі даследаванняў, метадалагічны апарат становіцца больш разнастайным і адпавядае сучасным тэндэнцыям вывучэння гістарычных працэсаў.

Дарэвалюцыйны перыяд гістарыяграфіі кантрыбуцыйных мерапрыемстваў характарызуецца вывучэннем заканадаўчых актаў і аналізам эфектыўнасці кантрыбуцыйных і абмежавальных заканадаўчых нормаў для вырашэння пастаўленай урадам мэты паступовай уніфікацыі беларускіх губерняў з цэнтральнымі. Кантрыбуцыйныя мерапрыемствы ўяўлялі сабой унікальны прэцэдэнт у юрыспрудэнцыі Расійскай імперыі, таму ў 1890-х гг. былыя і дзеючыя чыноўнікі з адміністрацыі віленскага генерал-губернатарства спрабуюць прааналізаваць кантрыбуцыйныя і абмежавальныя законы. Дадзеная дзейнасць была абумоўлена патрэбай дзяржаўнага апарату ў асэнсаванні мер, праведзеных пасля паўстання 1863 г., і іх практычнага значэння.

Такім чынам, распрацоўкай пытання кантрыбуцыйных збораў пачалі займацца чыноўнікі мясцовай адміністрацыі з юрыдычнай адукацыяй. Першай працай стала даследаванне Б. Г. Альшамоўскага «Права по землевладению в Западном крае» [1]. У якасці адной з галоўных заслуг працы можна адзначыць тое, што ў ёй не толькі ў поўным аб’ёмы пералічаны даступныя на той момант заканадаўчыя меры па абмежаванні закона, але і прааналізаваны недапрацоўкі, разглядаюцца судовыя справы, якія пацвярджаюць недапрацаванасць законаў, да таго ж вельмі важнай часткай працы з’яўляецца крытыка абмежавальных законаў, аўтар указвае на эканамічныя праблемы, выкліканыя дзеяннем абмежавальных і кантрыбуцыйных законаў. Услед за гэтым выходзіць выданне С. Г. Грамачэўскага «Ограничительные законы по землевладению в Западном крае» [2]. Дадзеная праца не настолькі дэтальна сканцэнтравана на аспектах практычнага выкання законаў, таксама амаль не надаецца ўвагі кантрыбуцыйным мерапрыемствам.

Паступовая праблематыка ўрадавых мерапрыемстваў з’яўляецца ў выданнях публіцыстаў і грамадскіх дзеячаў, напрыклад, у працы заходнерусіста П. М. Жуковіча [3]. У пачатку XX ст., які характарызуецца актыўным развіццём беларускага нацыянальнага руху, з’яўленнем перыядычных выданняў і публікацый, паступова ўзнікае інтарэс да ўрадавай палітыкі ў прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху. Першым беларускім грамадскім і палітычным дзеячам, які асэнсаваў і прааналізаваў вынікі ўрадавай палітыкі ў беларускіх губерняў, стаў Антон Луцкевіч [4; 5]. Ён прывёў свой погляд на наступствы ўрадавай палітыкі і іх ролю ў становішчы беларускага сялянства. А. Луцкевіч першы займаўся статыстычным аналізам праблемы зямельнага голаду беларускага сялянства,

у якім бачыў наступствы ўрадавай палітыкі абмежаванняў і кантрыбуцый. А. Луцкевіч лічыў, што падобныя абмежаванні штучна ставараюць праблему запавольвання працэсаў зямельнай мабільнасці. Канстанцыя Скірмунт [6] у сваіх публікацыях адзначала негатыўны ўплыў урадавых мерапрыемстваў на зямельнае становішча беларускіх сялян і дробнай шляхты. У працы Леана Васілеўскага [7] пададзены аналіз сацыяльна-эканамічнага становішча беларускіх губерняў у пачатку XX ст.

Дарэвалюцыйны перыяд гістарыяграфіі кантрыбуцыйных мерапрыемстваў прадстаўлены працамі прадстаўнікоў чыноўніцкага апарату Расійскай імперыі, дзе аналіз кантрыбуцыйных мерапрыемстваў праводзіўся па прычыне неабходнасці ўдасканалення заканадаўчай сістэмы. У дадзеных працах падаецца падрабязны аналіз законаў, асобных судзебных прэцэдэнтаў, але не разглядаюцца прычыны, наступствы і працэс рэалізацыі дадзеных заканадаўчых актаў. Публіцысты беларускага і польскага нацыянальнага руху спрабавалі прааналізаваць сацыяльна-эканамічныя наступствы кантрыбуцыйных і абмежавальных мерапрыемстваў, публікацыі прадстаўнікоў заходнерусісцкага кірунку ўяўлялі сабой заклік працягваць палітыку абмежаванняў. Асноўным недахопам дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі з’яўляецца відавочная суб’ектыўнасць, характар прац быў абумоўлены тым, што распрацоўкай праблематыкі займаліся ў асноўным прадстаўнікі чыноўніцкага апарату і грамадскія дзеячы.

Савецкі перыяд гістарыяграфіі можна ахарактарызаваць як пачатак паўнавартасных даследаванняў гістарычных працэсаў XIX ст. на тэрыторыі Беларусі. Для гістарыяграфіі савецкага перыяду характэрна марксісцкая інтэрпрэтацыя гістарычных працэсаў, асноўныя падзеі XIX ст. разглядаліся ў рамках фармацыйнай тэорыі і павінны былі адпавядаць тэзісу аб паслядоўнай барацьбе рабочых і сялян супраць прыгнёту. Фарміраванне марксісцка-ленінскай гістарычнай школы адбываецца ў 1920–1930-х гг., пры гэтым метадалогія даследавання звужалася нават у рамках марксісцкай тэорыі і цалкам залежала ад афіцыйнай ідэалогіі камуністычнай партыі на розных этапах існавання БССР. Падобны падыход меў свае асаблівасці ў трактоўцы класавай барацьбы і стану фарміравання капіталізму ў Расійскай імперыі, але сыходзіў з аднабокай ацэнкі ўрадавай палітыкі як рэакцыйнай.

Першай манаграфіяй, дзе дастаткова дэтальна былі прааналізаваны ўрадавыя мерапрыемствы, у тым ліку і кантрыбуцыі, стала праца Аляксандра Цвікевіча [8]. Праца А. Цвікевіча мае дастаткова шырокую інфармацыйную базу, аўтар выкарыстаў шматлікія крыніцы, звяртаў увагу на агульны кірунак развіцця ўрадавай палітыкі пасля паўстання 1863–1864 гг. Ускосна ўрадавыя мерапрыемствы разглядаюцца ў працы Мітрафана Доўнар-Запольскага «Народная гаспадарка Беларусі. 1861–1914 гг.», якая была першай манаграфіяй у айчыннай гістарыяграфіі, прысвечанай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў беларускіх губерняў перыяду капіталізму [9].

Фрагментарна ўрадавая палітыка Расійскай імперыі разглядалася ў працы У. І. Пічэты [10].

У савецкай гістарыяграфіі 1930-х гг. адметная праца С. М. Драніцына і Д. А. Дудкова [11]. У пасляваеннай савецкай гістарыяграфіі выдзяляюцца працы К. І. Шабуні [12] і Л. П. Ліпінскага [13]. Так, К. Шабуня адзначаў, што наступствамі ўрадавай палітыкі стала запавольванне зямельнай мабільнасці, пераўтварэнне гаспадарчай структуры беларускіх губерняў у манапалісцкую з буйнымі латыфундыямі. Разгляду асноўных кірункаў сацыяльна-саслоўнай урадавай палітыкі ў дачыненні да дваранства і сялянства Беларусі ў другой палове XIX ст. прысвечана манаграфія С. М. Самбук [14], якая часткова датычыцца праблематыкі кантрыбуцыйных збраў, у ёй выкладзены асноўныя моманты палітыкі расійскага ўрада ў дачыненні да кантрыбуцыйных збораў.

Вывучэнню беларускага сялянства ў айчыннай гістарыяграфіі савецкага перыяду нададзена значна большая ўвага. У першую чаргу трэба вылучыць працы В. П. Панюціча, які разглядаў ацыяльна-эканамічныя працэсы ў беларускай вёсцы ў акрэслены перыяд [15]. Разам з гэтым ён шматгранна вывучыў гісторыю пазямельных адносін, вытворчыя сілы сялянскай гаспадаркі, палітыку расійскіх улад у аграрнай сферы, што непасрэдным чынам датычыцца тэмы кантрыбуцыйных мерапрыемстваў.

Сучасная беларуская гістарыяграфія адрозніваецца істотным пашырэннем тэматыкі даследаванняў, пошукам новых метадалагічных падыходаў. Асаблівы інтарэс сучасных айчынных даследчыкаў выклікае гісторыя Беларусі XIX–XX стст., што абумоўлена важнасцю дадзенага гістарычнага перыяду для аналізу сацыяльна-эканамічных працэсаў на тэрыторыі Беларусі.

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі праблематыцы ўрадавай палітыкі, асабліва яе вынікаў, прысвечаны працы А. Г. Каханоўскага. У манаграфіі А. Г. Каханоўскага «Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914)» [16] разглядаюцца сацыяльная структура беларускага грамадства і яе эвалюцыя, урадавая палітыка, эканамічны стан беларускіх губерняў і інш. Праца А. Г. Каханоўскага стала першым і ўнікальным падобным даследаваннем праблем сацыяльнай трансфармацыі беларускага грамадства ў гістарыяграфіі, яна дазваляе прасачыць тэндэнцыі, законы функцыянавання і развіцця беларускага грамадства ва ўмовах мадэрнізацыйных працэсаў. Пад кіраўніцтвам А. Г. Каханоўскага на гістарычны факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта дзейнічае навуковая школа «Сацыяльнай гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст.». Вынікам дзейнасці навуковай школы стаў шэраг навуковых прац, прысвечаных актуальным пытанням гісторыі Беларусі, дзе былі ўлічаны некаторыя аспекты дзеяння кантрыбуцыйных мерапрыемстваў. Сярод дадзеных прац неабходна выдзеліць манаграфію В. С. Макарэвіча «Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай

імперыі (канец XVIII – начала XIX ст.)» [17]. У манаграфіі асвятляецца шэраг момантаў, звязаных з асаблівасцямі «разбору шляхты», разглядаецца механізм дзеяння падобных мер, паралельна аўтар акцэнтуе ўвагу на ўплыве на становішча шляхты і іншых мерапрыемстваў урада Расійскай імперыі. Праца А. В. Бурачонка [18] дазваляе прасачыць асобныя аспекты наступстваў кантрыбуцыйных мерапрыемстваў для эканамічнага стану беларускіх губерняў. Таксама асобныя аспекты ўрадавай палітыкі адлюстраваны ў працах Г. І. Маскевіч [19] і Г. А. Стралені [20].

Урадавую палітыку расійскага ўрада ў дачыненні да каталікоў разглядае беларускі гісторык А. Ф. Смалянчук. У манаграфіі «Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864–1917 г.» [21] А. Ф. Смалянчук прыходзіць да высновы, што шляхта беларускіх губерняў ва ўмовах жорсткай асіміляцыйнай і абмежавальнай палітыкі апынулася ў новых умовах, калі з іх інтарэсамі не збіраліся лічыцца і болей таго адмаўлялі права на ўласную нацыянальна-культурную ідэнтычнасць.

Разгляду дваранства беларускіх губерняў прысвечана праца А. П. Жытко [22]. У працы А. П. Жытко разглядаюцца і кантрыбуцыйныя мерапрыемствы, аўтар адзначае сур'ёзныя страты, нанесеныя дзеяннем кантрыбуцый, якія адбіліся на матэрыяльным становішчы землеўладальнікаў і мелі сваім наступствам запавольванне развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы гаспадарак землеўладальнікаў беларускіх губерняў.

Фрагментарна праблематыка кантрыбуцыйных мерапрыемстваў і абмежаванняў закранаецца ў працах С. М. Токця [23], Н. І. Палятаевай [24], К. С. Цярашковай [25], Н. С. Маторавай [26], В. У. Церашковіча [27], В. А. Кахновіча [28], В. В. Яноўскай [29], Дз. Ч. Матвейчыка [30], А. Э. Фірыновіч [31]. У працы А. Р. Радзюка [32] прадстаўлены аналіз прававых палажэнняў канфіскацыі зямельных уладанняў і прааналізавана адпаведная статыстыка. Даследаванне праблемы кантрыбуцыйных мерапрыемстваў знайшло адлюстраванне ў шэрагу калектыўных прац: «Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг.» [33], другі том «Белорусская государственность в период Российской империи (конец XVIII – начало XX в.)» [34] са шматтомнага выдання «История белорусской государственности», «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)» [35].

Такім чынам, у сучаснай беларускай гістарыяграфіі актыўна развіваецца вывучэнне сацыяльнай і эканамічнай гісторыі Беларусі. Павышаны інтарэс сучасных гісторыкаў да працэсаў гісторыі Беларусі XIX ст. дазваляе стварыць уяўленне аб асобных аспектах урадавай палітыкі, але тэма кантрыбуцыйных мерапрыемстваў разглядалася толькі фрагментарна.

У апошнія гады значную актыўнасць у вывучэнні эвалюцыі ўрадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі, праяўляюць расійскія даследчыкі. Да іх ліку належаць М. Д. Далбілаў [36], А. І. Міллер [37] і А. А. Камзола-

ва [38]. Аднак расійскім даследчыкам уласціва невыкарыстанне ці слабое выкарыстанне багацейшых фондаў беларускіх архіваў і беларускай гістарыяграфіі. Праца М. Д. Далбілава ў асноўным скіравана на рэлігійнае пытанне ў заходніх губернях і толькі часткова ахоплівае праблематыку кантрыбуцыйных і абмежавальных законаў. Праца А. А. Камзолавай у гэтым плане прадстаўляе большую каштоўнасць для даследавання дадзенай тэмы. У гэтай працы аўтар імкнуўся ахапіць усе бакі палітыкі віленскіх генерал-губернатараў, пры гэтым пададзена дэталёвая, але дастаткова каштоўная інфармацыя. Фрагментарна працэсы сацыяльна-эканамічных наступстваў урадавых мерапрыемстваў закранаюцца ў працы Б. М. Міронава [39].

У польскай гістарыяграфіі дадзеная тэма, нягледзячы на дастатковую важнасць гэтай праблемы і для польскай гістарычнай навукі таксама, амаль не разглядалася дэтальна. Праблема кантрыбуцыйных мерапрыемстваў закранаецца ў даследаванні Давіда Файнгаўза [40]. Праблеме наступстваў паўстання 1863–1864 гг., у прыватнасці, праблемам кантрыбуцый і абмежаванняў на тэрыторыі беларускіх губерняў, Давід Файнгаўз прысвяціў асобную главу сваёй манаграфіі, дзе з апорай у тым ліку і на фонды беларускіх архіваў, прыводзіць дадзеныя па ўрадавай палітыцы ў беларускіх губернях. Але аўтар закранае перыяд толькі першых гадоў пасля паўстання, у той час як дзеянне кантрыбуцыйных збораў ахоплівае значна большы перыяд.

Праблемы дробнай шляхты, аднадворцаў і чыншавікоў у беларускіх губернях закранае Іёланта Сікорска-Кулеша [41]. Асаблівую ўвагу даследчыца надае вызначэнню прычын і працэсаў маргіналізацыі дробнай шляхты на тэрыторыі беларускіх губерняў, ускосна аўтар разглядае ўплыў кантрыбуцыйных мерапрыемстваў на працэсы маргіналізацыі дробнай шляхты. Дзейнасці польскіх грамадскіх арганізацый, праблематыцы адносін польскага грамадскага прадстаўніцтва і расійскай адміністрацыі прысвечаны працы Рамана Юркоўскага [42]. Аўтарам закранаецца тэма кантрыбуцыйных збораў у кантэксце аналізу асноўных патрабаванняў польскіх землеўладальнікаў да расійскай адміністрацыі. Палітычнай і сацыяльнай гісторыі Польшчы прысвечана праца польскага гісторыка Анджэя Язерскага [43]. Праца ў асноўным прысвечана стану гаспадаркі тэрыторыі Польшчы, сітуацыі на тэрыторыі беларускіх губерняў у працы прысвечана асобная глава.

Фрагментарна палітыку абмежаванняў разглядалі некаторыя польскія даследчыкі, у тым ліку Станіслаў Ланец [44], Стэфан Кеневіч [45], Пётр Вандыч [46]. Вывучэнню ўрадавай палітыкі ў дачыненні да заходніх губерняў прысвечана манаграфія «Расійская нацыяльнальная палітыка ў заходніх губернях імперыі (1863–1905)» польскага гісторыка Вітальда Радкевіча [47], які разглядае праблематыку абмежаванняў, скіроўваючы ўвагу на аспект маёмаснага права польскіх землеўладальнікаў у заходніх губернях.

Тэма кантрыбуцыйных і абмежавальных мерапрыемстваў разглядаецца ў працах літоўскіх гісторыкаў. Адным з першых у літоўскай гістарыяграфіі, аналіз сацыяльна-эканамічных працэсаў у другой палове XIX с. правёў гісторык Рымантас Вебра ў манаграфіі «Літоўскае грамадства ў другой палове XIX ст.: асаблівасці сацыяльнай структуры» [48]. Дастаткова падрабязны аналіз урадавай палітыкі, кантрыбуцыйных і абмежавальных мерапрыемстваў на тэрыторыі Віленскай, Ковенскай і Гродненскай губерняў правёў у сваёй манаграфіі Дарыюс Сталюнас [49], які зрабіў выснову, што кантрыбуцыйныя і абмежавальныя мерапрыемствы адрозніваліся ў сістэме рэалізацыі ўрадавай палітыкі. Д. Сталюнас адзначае, што колькасць вызваленых ад кантрыбуцыйных збораў пераўзыходзіла колькасць землеўладальнікаў, якім было дазволена набыццё зямельнай маёмасці, у чатыры разы.

Закранаецца тэма кантрыбуцый і абмежаванняў і ў французскай гістарыяграфіі ў кантэксце дзеяння дадзеных прававых нормаў на тэрыторыі ўкраінскіх губерняў. У працах Даніэля Бовуа [50; 51] разглядаецца становішча чыншавікоў і аднадворцаў, уплыў кантрыбуцыйных і абмежавальных мерапрыемстваў на працэсы. Ва ўкраінскай гістарыяграфіі дадзеная тэма амаль не разглядалася. Ускосна праблематыка кантрыбуцый і абмежаванняў у дачыненні да землеўладальнікаў на тэрыторыі Правабярэжнай Украіны ў складзе Расійскай імперыі закраналася ў манаграфіі Яўгена Чарнецкага [52].

Такім чынам, у беларускай і замежнай гістарыяграфіі дастаткова падрабязна разгледжаны асноўныя мерапрыемствы ўрада Расійскай імперыі на тэрыторыі беларускіх губерняў. У шматлікіх працах адлюстраваны аспекты рэалізацыі абмежавальнай палітыкі, аднак, нягледзячы на гэта, тэма кантрыбуцыйных мерапрыемстваў амаль не разглядалася ў гістарыяграфіі і не стала прадметам адмысловага даследавання.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Ольшамовский, Б. Г.* Права по землевладению в Западном крае / Б. Г. Ольшамовский. – СПб.: Типо-лит. Ю. А. Мансфельд, 1899. – 139 с.

2. *Громачевский, С. Г.* Ограничительные законы по землевладению в Западном крае / С. Г. Громачевский. – СПб.: Типо-лит. Н. К. Мартынов, 1904. – 173 с.

3. *Жукович, П. Н.* О русском землевладении в Северо-Западном крае со времени присоединения его к России / П. Н. Жукович. – СПб.: Печатня С. Яковлева, 1895.

4. *Луцкевіч, А.* Атчот аб гаспадарцы гасударственным дабром / А. Луцкевіч // Барацьба за вызваленне. – Беласток: Беларус. гіст. тав-ва, 2009. – 649 с.

5. *Луцкевіч, А.* К пытанью аб нацыянальных адносінах у Беларусі і Літве / А. Луцкевіч // Да гісторыі беларускага руху. – 3-е выд. – Смаленск: Інбелкульт, 2015. – 346 с.

6. *Skirmuntt, K.* O prawdę i zgodę z powodu głosu Litwinów do magnatów, obywateli i szlachty na Litwie i odpowiedzi młodego szlachcica litewskiego / K. Skirmuntt. – Lwów: Druk A. Goldmana, 1906. – 24 s.

7. *Wasilewski, L.* Litwa i Białoruś. Przeszłość – teraźniejszość i tendencje rozwojowe / L. Wasilewski. – Kraków: Spółka nakładowa «Książka», 1912. – 405 s.

8. *Цьвікевіч, А*. «Западно-руссизм»: нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – 2-е выд. – Менск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

9. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі; пер. з рус. Т. М. Бутэвіч, Т. М. Кароткая, Е. П. Фешчанка. – Мінск: БелЭн, 1994. – 510 с.

10. *Пічэта, У. І.* Гісторыя Беларусі / У. І. Пічэта. – Мінск: Выд. цэнтр Беларус. дзярж. ун-та, 2005. – 178 с.

11. *Драницын, С. Н.* Польское восстание 1863 г. и его классовая сущность / С. Н. Драницын. – Ленинград: Соцэкгиз, Ленинград. отд-ние, 1937. – 300 с.

12. *Дудкоў, Д. А.* Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў 2-й палове XIX і пачатку XX стагоддзя / Д. А. Дудкоў. – Мінск: Дзярж. выд. Беларусі; Партмассектар, 1932. – 223 с.

13. *Липинский, Л. П.* Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.) / Л. П. Липинский. – Минск: Наука и техника, 1971. – 252 с.

14. *Самбук, С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. / С. М. Самбук. – Минск: Наука и техника, 1980. – 224 с.

15. *Панютич, В. П.* Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. / В.П. Панютич. – Минск: Акад. наук БССР, Ин-т истории: Навука і тэхніка, 1990. – 374 с.

16. *Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т., 2013. – 335 с.

17. *Макарэвіч, В. С.* Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII–XIX ст.) / В. С. Макарэвіч. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т. , 2018. – 315 с.

18. *Бурачонак, А. В*. Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі (1861–1914 гг.): дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. В. Бурачонак. – Мінск, 2012. – 183 л.

19. *Маскевіч, Г. І.* Сацыяльная стратыфікацыя сялянства Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст.: тдыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / Г. І. Маскевіч. – Мінск, 2010. – 164 л.

20. *Страленя, А. А.* Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец XIX в. – 1914 г.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / А. А. Страленя. – Минск, 2017. – 169 л.

21. *Смалянчук, А. Ф.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864–1917 / А. Ф. Смалянчук. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 322 с.

22. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму, 1861–1914 гг. / А. П. Жытко. – Мінск: БДПУ, 2003. – 233 с.

23. *Токць, С. М.* Беларуская вёска ў эпоху зьменаў. Другая палова XIX – першая траціна XX ст. / С. М. Токць. – Менск: Тэхналёгія, 2007. – 308 с.

24. *Полетаева, Н. И.* Купечество Беларуси: 60-е гг. XIX – начало XX в.: монография / Н. И. Полетаева. – Минск: БГЭУ, 2004. – 247 с.

25. *Церашкова, К. С.* Мяшчане ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларуска-літоўскіх губерняў (1861−1914 гг.) / К. С. Церашкова. − Мінск: Беларус. навука, 2018. – 314 с.

26. *Моторова, Н. С.* Социальная политика Российской империи на территории Беларуси (1861–1914) / Н. С. Моторова. – Минск: Нац. б-ка Беларуси, 2019. – 350 с.

27. *Терешкович, П. В.* Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: в контексте Центрально-Восточной Европы / П. В. Терешкович. – Минск: БГУ, 2004. – 223 с.

28. *Кохнович, В.* Хозяйство в имениях на Полесье в 1861–1914 гг. / В. Кохнович. – Saarbrücken: Lambert acad. publ., 2015. – 358 с.

29. *Яноўская, В. В.* Хрысціянская царква ў Беларусі 1863–1914 гг. / В. В. Яноўская. – Мінск: БДУ, 2002. – 198 с.

30. *Матвейчык, Дз. Ч.* Канфірмацыя як спецыфічны від крыніцы па гісторыі паўстання 1863–1864 гадоў (на падставе матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / Дз. Ч. Матвейчык // Архівы і справаводства: навукова-практычны ілюстраваны часопіс. – 2015. – № 2.

31. *Фірыновіч, А. Э.* Адгалоскі паўстання 1863–1864 гг. у беларуска-літоўскіх губернях / А. Э. Фірыновіч // Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне: гісторыя і памяць: зб. навук. арт. / уклад. В. В. Яноўская, А. У. Унучак]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2014.

32. *Радзюк, А. Р.* Пад скіпетрам Расейскай імперыі – рэпрэсіўная палітыка царызму на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / А. Р. Радзюк. – Гародня-Кракаў, 2017. – 196 с.

33. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.]; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2018. – 573 с.

34. История белорусской государственности: в 5 т. / Н. В. Смехович [и др.]; отв. ред. тома. Н. В. Смехович, А. В. Унучек, Е. Н. Филатова; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск: Беларус. навука, 2019. – Т. 2: Белорусская государственность в период Российской империи (конец XVIII – начало XX в.). – 413 с.

35. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.]; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2020. – 684 с.

36. *Долбилов, М. Д.* Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М. Д. Долбилов. – М.: Новое обозрение, 2010. – 999 с.

37. Западные окраины Российской империи / Л. А. Бережная [и др.]; науч. ред.: М. Долбилов, А. Миллер; Междунар. благотвор. фонд им. Д. С. Лихачева. – М.: Новое литературное обозрение, 2007. – 605 с.

38. *Комзолова, А. А.* Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. – М.: Наука, 2005. – 383 с.

39. *Миронов, Б. Н.* Российская империя: от традиции к модерну / Б. Н. Миронов. – СПб.: Дмитрий Буланин, 2015. – Т. 2. – 912 с.

40. *Fajnhaus, D.* Litwa i Białoruś / D. Fajnhaus. – Warszawa: Neriton, 1999. – 357 s.

41. *Sikorska-Kulesza, J.* Deklasacja drobnej szlachty na Litwie i Białorusi w XIX wieku / J. Sikorska-Kulesza. - Pruszków, PL: Ajaks, 1995. – 112 s.

42. *Jurkowski, R.* Ziemiaństwo polskie Kresów Północno – Wschodnich 1864–1904. Działalność społeczno – gospodarcza / R. Jurkowski. – Warszawa: Duo, 2001. – 603 s.

43. *Jezierski, A.* Historia gospodarcza Polski / A. Jezierski, C. Leszczyńska. – Warszawa: Wydawnictwo Key Text, 2013. – 568 s.

44. *Łaniec, S.* Litwa i Białoruś w dobie konspiracji i powstania zbrojnego: 1861–1864 / S. Łaniec. – Olsztyn: Ośrodek Badań Nauk. im. Wojciecha Kętrzyńskiego w Olsztynie, 2002. – 196 s.

45. *Kieniewicz, S.* Historia Polski. 1795–1918 / S. Kieniewicz. – Warszawa: PWN Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1983. – 604 s.

46. *Wandycz, P.* The Landsof Partitioned Poland 1795–1918 / P. Wandycz. – Seattle: University of Washington Press, 1984. – 472 p.

47. *Rodkiewicz, W.* Russian Nationality Policy in the Western Provinces of the Empire (1863–1905) / W. Rodkiewicz. – Lublin: Scientific Society of Lublin, 1998. – 295 p.

48. *Vėbra, R.* Lietuvių visuomenė XIX a. antrojoje pusėje: socialinės struktūros bruožai / R. Vėbra. – Vilnius: Mokslas, 1990. – 267 p.

49. *Staliūnas, D.* Making Russians. Meaning and Practice of Russification in Lithuania and Belarus after 1863 / D. Staliūnas. – Amsterdam/New York: Rodopi, 2007. – 480 p.

50. *Бовуа, Д.* Гордиев узел Российской империи: Власть, шляхта и народ на Правобережной Украине (1793–1914). / Д. Бовуа; пер. с фр. М. Крисань. – М.: Новое лит. обозрение, 2014. – 1006 с.

51. *Beauvois, D.* Trójkąt ukraiński: Szlachta, carat i lud na Wołyniu, Podolu i Kijowszczyźnie 1793–1914 / D. Beauvois. – Lublin: Wydawnictwo UMCS, 2005. – 813 s.

52. *Чернецький, Є.* Правобережна шляхта за російського панування (кінець XVIII – початок XX ст.). Джерела, структура стану, роди / Є. Чернецький. – Біла Церква: Вид. О. В. Пшонківський, 2007. – 176 с.

**(Дата подачи: 23.02.2021 г.)**